*УДК 392.51(476.2-37Буда-Кашалѐва)*
**В. І. Краўцова**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ВЯСЕЛЛЕ Ў ВЁСЦЫ НЕГАЎКА БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА

*У артыкуле, прысвечаным вясельным абрадам і звычаям жыхароў в. Негаўка Буда-Кашалѐўскага раѐна Гомельскай вобласці, засяроджана ўвага на асобных абрадавых этапах вясельнага абрадавага комплексу. Аўтар на аснове ўласных экспедыцыйных матэрыялаў, запісаных ў в. Негаўка Буда-Кашалѐўскага раѐна, робіць спробу рэканструкцыі структуры мясцовага вяселля, аналізуе яго асноўныя абрадавыя этапы.*

Самай урачыстай падзеяй у сямейнай абраднасці на працягу стагоддзяў лічылася вяселле: «Стараліся праводзіць абрад вяселля, каб не было пастоў, а ў час пастоў забаранялася жаніцца ці выходзіць замуж, вянчацца. Гулялі вяселле абычна, каб не было пастоў». Варта адзначыць, што па структуры вясельны абрадавы комплекс беларусаў падзяляецца на наступныя перыяды: давясельны, уласна вясельны і паслявясельны. Звернемся да характарыстыкі давясельнага перыяду ў в. Негаўка Буда-Кашалѐўскага раѐна Гомельскай вобласці.

Зыходзячы з уласна запісанага фактычнага матэрыялу, давясельная частка ў вѐсцы Негаўка прадстаўлена такімі абрадавымі этапамі, як сватанне, запоіны, змовіны (заручыны).

Сватанне – адзін з найважнейшых этапаў вяселля, падчас якога павінны былі дамовіцца сваты і бацькі маладой аб тым, калі будзе вяселле, а таксама вырашыць пытанні, звязаныя з яго правядзеннем.



Сватанне суправаджалася іншасказальным дыялогам. Сваты, заходзячы ў хату, пыталіся, ці прадаецца цѐлачка, маючы на ўвазе нявесту: «Лепш было ісці сватацца ў дзень, каб не было пастоў. Сватаць абычна хадзілі вечарам. Хадзілі бацька з маткай хлопца, браты, хадзілі з сям‘ѐй сватаць. Некаторыя бралі сваіх хросных матку і бацьку. Заходзяць у хату:

– Ці прадаецца ў вас цѐлачка?

Або:

– Добры дзень вам, добрыя людзі! У вас штось прадаецца?

– Прадаецца, прадаецца.

– Пакажыце нам свой тавар… Харош тавар, харош!

ДЛЯ СЛУЖЕБНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

– І вы свой пакажыце.
– Наш тавар стое 100 тысяч» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г н.) [1, с. 67-68].
Звычайна бацькі дамаўляліся аб шлюбе сваіх дзяцей, калі тыя былі яшчэ малымі: «Дагаваралісь, калі нявеста не сагласна – давалі адказ. Багатыя ці бедныя, які род выбіралі раней. Харошы род – бралі. Бацькі дагаваралісь, калі дзеці яшчэ малыя былі. Пайдуць у сваты –дагаваруюцца. Другія не сходзіліся па харакцеру, па прывычках. Пайшлі ў сваты, было такое – адказалі. Цяпер ні ў кога не спрашуюць. Так не было калісь» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).
Адметны мясцовы момант сватання ў в. Негаўка – гэта апрануць перад пачаткам сватання ў новае адзенне будучую цѐшчу і прапанаваць ѐй новы абутак: «Калі прыходзілі ў сваты, жаніх даўжон адзець будушчую цѐшчу ў плацця і абуць туфлі, патом толькі начыналі сватаўство» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).
Як правіла, калі адбывалася сватанне, нявеста павінна была падараваць сватам падарункі: «Нявеста далжна адарыць падаркамі прышэдшых у сваты ў працэсі застолля» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).
Запоіны – другі абрадавы этап сватання. Звычайна на запоіны хадзілі ўвечары ў суботу ці ў нядзелю жаніх з бацькамі і сваякамі. На запоінах дзяўчыну як бы «запіваюць» да роду жаніха. Нявеста ад запоін да вяселля павінна была насіць толькі заплеценую касу.
На запоінах у вѐсцы Негаўка пелі жартоўныя песні:
*Піце, ешце, сваты,*
*Ды хваліце маці,*
*Што дзеўку гадавала,*
*Для вас наражала.*

*Ешце, піце, сваты, гарэлку,*
*Запівайце дзеўку* [1, с. 86-87].
Праз два тыдні пасля запоін прызначалася вяселле. Важны рытуал запоін – абменьванне хлебам паміж бацькамі маладых: «Перад тым, як ісці дамоў, бацькі маладых абменьваліся хлебам» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).
Змовіны (заручыны) – трэці давясельны абрадавы этап, які меў
ДЛЯ СЛУЖЕБНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

свае адметныя рысы. На гэтым этапе ўжо замацоўвалася згода на шлюб маладых. Дамаўляліся, якім будзе пасаг нявесты і калі будзе вяселле. На змовінах (заручынах) абменьваліся пярсцѐнкамі, якія купляў жаніх. Хлопца і дзяўчыну пасля змовін (заручын) ужо называлі маладым і маладой. Пасля змовін (заручын) ад шлюбу адмовіцца было амаль немагчыма.

Перад вяселлем ў хаце нявесты праводзілі абрад, які называлі «*зборная субота*», ці «*ѐлка*»: «Збіраліся сяброўкі нявесты, прыносілі ѐлачку з лесу, упрыгожвалі кветкамі з паперы. Атрымлівалі за гэта гасцінцы. Ёлка лічылася тады сімвалам жыцця, прыгажосці, маладосці. У той час, як маладую везлі да маладога ад ѐлкі стараліся ўзяць дамоў упрыгожванні, кветкі. Лічылася, што гэта прынясе членам сям‘і шчасце» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

Да ўласна вясельнай часткі абрадавага комплексу належыць таксама абрад падрыхтоўкі і падзелу каравая: «Калі дзялілі каравай, маладым дарылі падарункі ці грошы, а родным жаніха нявеста дарыла падарункі перад гэтым. На талерку, якую накрывалі хусткай ці ручніком клалі грошы. Кожны з гасцей атрымліваў кавалак каравая і выпіваў чарку за маладых. Калі каравай падзялілі, хросны бацька разбіваў талерку на шчасце» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

Маладыя, калі займалі свае месцы за сталом, павінны былі сядзець на кажусе, бо верылі, што гэта паспрыяе іх дабрабыту: «Каравай в то врэмя пеклі свой, круглы як хлеб ілі пеклі хвораст. Когда садзілі маладых за стол абязацельна, што б яны сядзелі на кажусе, каторый шылі самі з авечай кожы» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

Заслугоўваюць увагі звесткі інфарманта пра дзяжу, у якой замешвалі цеста на каравай: «Былі такія «дзежы» ў якіх пеклі хлеб. Дежы етыя накрывалісь спецыяльнай крышачкай. Етая крышачка называлась «вечка». На етае «вечка» лажылі каравай і хросны нѐс на галаве етае «вечка» з караваем, прасіў разрашэнне ў бацькі, маці разрашалі, патом хросны бацька абрашчаўся к гасцям: «Госці,



разрышыцця каравай благаславіць». Госці гаварылі: «Бог благаславіць» (паўтаралі 3 разы). І патом пачыналі дзяліць каравай, як і ўсюды» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

ДЛЯ СЛУЖЕБНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

Дзяльба каравая суправаджалася рознымі пажаданнямі. Сват выклікаў усіх гасцей падараваць на каравай, а тыя адорвалі маладых, прамаўляючы:
*Колькі ў лесе пянькоў,*
*Каб было столькі сынкоў.*
*Колькі на бярозе почак,*
*Каб столькі было дочак.*
*Дарую бочку капусты,*
*Каб не давала мужыку распусты.*
*Дарую бочку гуркоў,*
*Каб не любіла чужых мужыкоў* [1, с. 77].

Варта адзначыць цікавую мясцовую дэталь («біццѐ» рамнѐм маладых), якая мела месца на вяселлі ў в. Негаўка і вылучалася адметнай семантыкай – спрыяць дабрабыту маладой сям‘і: «Вясельны каравай не ў каждага роўны, ізабражалі, хто калоссе якое выкладаў на тым караваі, у чым яны былі уверанны, такі і каравай. Калісь пяклі каравай з свайго зерня. Кагда заканчывалі дзяліць каравай, жаніха і нявесту білі рамнѐм, ані ўбегалі з-за стала, паследні раз білі, што б яны харашо жылі» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

Зыходзячы з фактычнага матэрыялу, у в. Негаўка вяселле працягвалася некалькі дзѐн: «Первы дзень гулялі ў нявесты, госці дарылі падаркі на каравай. Каравай дзяліў хросны бацька, вызываў усіх гасцей нявесты. Ён наліваў чарку, а дружка лажыла кусочак караваю і брала падаркі» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.). На другі дзень вяселля («перазоў») «госці ехалі гуляць к жаніху, і везлі з сабой прыданнае нявесты, і прасілі выкуп за прыданнае. Кагда выкуп палучалі, гасцей прыглашалі за стол і ўсе госці гулялі, патом госці жаніха дзялілі каравай, а патом ўсе дзеньгі шчыталі быстра, штоб ўсѐ вялося і харашо жылося» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

На трэці дзень вяселля, які называлі «*цыганы*», збіраліся ў хаце жаніха, а затым «ішлі да нявесты гуляць, патом ад нявесты зноў да жаніха без маладых» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.). У паслявясельнай абраднасці в. Негаўка вылучаўся і такі момант, як «*госці*»: «Госці» маглі быць на чацвѐрты дзень вяселля. Госці нявесты ехалі к жаніху, іх устрачалі маладыя парні, пераадзетыя ў рыцараў, сядзяшчых на лашадзях. Яны прэдлагалі ім



ДЛЯ СЛУЖЕБНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ

угашчэнне з бальшой дарогі. Госці, перадзетыя ў дактароў, аказывалі помашч медзіцынскую. Эта была такая ігра» (запісана ад Краўцовай Марыі Сцяпанаўны, 1948 г. н.).

Такім чынам, вясельная абраднасць на Буда-Кашалёўшчыне вызначаецца сваімі яскравымі мясцовымі звычаямі, пры гэтым многія традыцыі яго ўстойліва захоўваюцца і сёння.

**Спіс літаратуры**

1 Вяселле на Гомельшчыне : фальклорна-этнаграфічны зборнік / рэд. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск : ЛМФ ―Нёман‖, 2003. – 472 с.

ДЛЯ СЛУЖЕБНОГО ПОЛЬЗОВАНИЯ